

## "І МЫ ЖЫЛІ... І МЫ ЛЮБІЛІ."

*Прадажных*
*здрайцаў ліхвяры*
*Мяне зацiснулі за краты.*
*Я прысягаю вам, сябры,*
*Мае палі, мае бары,*
*Кажу вам: я не вінаваты.*
*Паверце: я не вінаваты!*

***Міхась Чарот.***

Радок "І мы жылі... І мы любілі." з верша Юлія Таўбіна, прысвечанага Зм. Астапенку і радкі з верша "Прысяга" Міхася Чарота, напісанага на сцяне адзіночнай камеры, мне ўзгадаліся пасля прагляду фільма "Катынь" польскага рэжысёра Анджэя Вайды.

Магілёўская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны сумесна з клубам "Натхненне" і гарадской Цэнтральнай бібліятэкай арганізавала кінаклуб, у рамках якога адзін раз у месяц ладзіцца прагляд беларускамоўных фільмаў і фільмаў, проста ці ўскосна звязаных з гісторыяй нашай краіны. 29 кастрычніка сябры кінаклуба мелі магчымасць паглядзець фільм "Катынь", у якім Анжэй Вайда распавядае аб масавым знішчэнні насельніцтва, пасля раздзелу Польшчы паміж СССР і гітлераўскай Германіяй.

Перад пачаткам фільма была запалена свечка у памяць пра загінулых, якая гарэла ўвесь вечар. Старшыня Магілёўскага ТБМ Алег Дзьячкоў ва ўступным слове расказаў, чаму прагляд фільма ладзіцца менавіта ў гэты дзень. Таму што 29 кастрычніка 1937 года ў Менску адбылася бесчалавечная акцыя, у выніку якой загінула больш за пяць дзесяткаў таленавітых беларускіх і яўрэйскіх літаратараў, а таксама дзяржаўных дзеячаў і вучоных. У іх ліку былі названы імёны выхадцаў з Магілёўшчыны. Гэта літаратары: Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Юрка Лявонны, Зяма Півавараў, Арон Юдэльсон; наркам асветы БССР Ананій Дзьякаў, былы наркам асветы БССР Аляксандр Варончанка, загадчык секцыі геаграфіі і інстытута эканомікі АН БССР Стэфан Маргелаў, выканавец абавязкаў рэктара БДУ Аляксей Кучынскі і іншыя. *(Леанід Маракоў. Ахвяры і карнікі. Менск, 2007).*

Кожны з загінуўшых крычыць нам у сёння словамі з верша М. Чарота: "...я не вінаваты. Паверце: я не вінаваты!" І мы ведаем, што ўсе яны сталі ахвярамі дыктатарскай сістэмы.

Спадар Дзьячкоў распавядаў яшчэ пра тое, што трагедыя ў Катыні таксама мае дачыненне да дыктатарскай сістэмы, пра тое, што няма адназначнага погляду на падзеі ў Катыні. У палякаў свая праўда, у рускіх – свая. Беларусы тут як бы ні пры чым. ¨н спаслаўся на кнігу беларускага гісторыка Ігара Кузняцова "Засакрэчаныя трагедыі савецкай гісторыі"(Менск, 2006), дзе аўтар сцвярджае думку аб тым, што гэта трагедыя не толькі польскага народа, яна тычыцца ўсіх народаў, якія жылі на тэрыторыі тагачаснай Польшчы. У іх ліку былі і этнічныя беларусы, але без пэўных дакументаў гэта можна ўстанавіць толькі ўскосным шляхам.

Узгадалася адна гісторыя, якую мне расказала маці. У час акупацыі фашыстамі Беларусі ў нашай вёсцы засталося ўсяго тры хаты, у тым ліку і наша, маленькая на адзін пакой. У ёй і размясціліся немцы. Адзін з афіцэраў атрымаў пісьмо, у якім паведамлялася, што яго сям'я – жонка і дзеці – загінулі. ¨н скрушна глядзеў на фотаздымак сваёй сям'і і паўтараў: "Гітлер капут, Сталін капут..." Для многіх людзей сталінскі рэжым і рэжым Гітлера былі аднолькавымі – знішчальнымі.

Перад пачаткам фільма прагучала кампазіцыя-рэквіем гурта BN і Лявона Вольскага (аўтар тэкста С. Машковіч). У зале панавала атмасфера суперажывання, многія плакалі. Адзін з прысутных, Сяргей Дымкоў, пасля прагляду сказаў: "Фільм аб страшнай трагедыі не толькі польскага народа. Я не мог стрымаць слёзы. Але фільм лічу пазітыўным. ¨н дае мне сілу жыць, жаданне зрабіць што-небудзь карыснае для жывых і помніць пра тых, каго няма".

***Тамара Аўсяннікава, Магілёў.***




*Хлеб 3-га менскага хлебазавода "Бацькоўскі край"*

# Мастацтвазнаўцы Беларусі не патрэбныя?!

Прыём студэнтаў у Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці мастацтвазнаўства ажыццяўляецца праз два гады, то бок прымаюць на першы курс не кожны год. Выглядае, няма куды дзяваць кадры, альбо няма ахвочых атрымаць такую адукацыю?

Магчыма, у межах Менска мастацтвазнаўцаў і дастаткова, аднак Беларусь па-за сталіцай не сканчваецца. Век маладосці кароткі і нельга марнаваць час, чакаючы правядзення ўступных іспытаў, пры тым, што стаць студэнтам можа і не ўдасца. ¨сць, аднак, краіны, дзе на творчыя дысцыпліны ВНУ прымаюць студэнтаў па два разы на год - кожны семестр.

Колькасць работнікаў, якія маюць дыплом мастацтвазнаўцы і якія працуюць у сістэме культуры ў раёнах рэспублікі вымяраецца круглай лічбай: 0. Пагалоўе жывёлы - важная справа, аднак клапаціцца трэба і аб людзях. Кінуўшы пірожнае, у сярэдніх і абласных гарадах у мастацтвазнаўцу наўрад ці патрапіш. Такая "цывілізаванасць" у галіне культуры пацвярджае статус Менска як сталіцы еўрапейскіх задворкаў.

Ніша для спецыялістаў з добрай арт-адукацыяй сёння свабодная, калі рухацца ад "культпросвета к свету". Такія спецыялісты ў апараце аддзелаў культуры гар-райвыканкамаў, упраўленняў культуры аблвыканкамаў, метадычных цэнтраў справу б не сапсавалі. Гісторыю мастацтва ў школах мастацтваў таксама павінен выкладаць не выпускнік "худграфа" (па дыпломе настаўнік чарчэння, малявання і працоўнага навучання), а мастацтвазнаўцы. Дыплом выкладчыка сусветнай мастацкай культуры і мастацтвазнаўства, гэта таксама не адно і тое ж. Прафесіяналы такога ўзроўню, калі б яны былі ў наяўнасці, маглі б упрыгожыць сабой і штаты супрацоўнікаў музеяў, выставачных залаў.

Адукацыя ў галіне мастацтва спалучае прафесію і класічнае хобі. Для таго каб разабрацца: хто каму гол забіў, адукацыя не патрэбная. А вось "веданне" ў галіне мастацтва ў нашай краіне рэдкая з'ява, хоць мастацтвам народ і нельга сапсаваць. На спецыяльнасць мастацтвазнаўства трэба пашыраць прыём на бюджэтнае навучанне, а на платнае вочназавочнае прымаць без абмежавання колькасці. Вывучаць мастацтва ідуць людзі зацікаўленыя ў ім, а не ў месце пад сонцам, якія на іншыя спецыяльнасці не пайшлі б вучыцца нават пры гарантаваным прыёме ў лепшыя ВНУ.

Вядомы факт: у іншых краінах маладыя спадчынныя прынцы, атрымаўшы вайсковую адукацыю, потым яшчэ вывучаюць на ўніверсітэтах і мастацтва. Калісьці ж павінны і ў нас з'явіцца прадпрымальнікі, гаспадарчыя і тэрытарыяльныя кіраўнікі, міністры, сенатары і прэзідэнты, якія будуць лятаць прыватным чынам у іншыя краіны і гарады на мастацкія выставы, оперныя прэм'еры, выступы сімфанічных аркестраў. Да Еўропы трэба набліжацца і з гэтага боку.

Мастацтва і арт-адукацыя - асаблівая, далікатная галіна ведаў, духоўнасці і пачуццяў. Яна патрабуе выкладчыкаў высокага ўзроўню не фармальна, а па сутнасці, якіх заўсёды мала, як і мастацтва. Яго ласт - гэта толькі бензінавая пляма на вадзе, дзе самы ніз - ужо мастацкая культура. Такая адукацыя патрабуе асаблівага асяроддзя з высокай канцэнтрацыяй мастацкай інфармацыі: мастацкія музеі, вялікая колькасць выстаў... Для поспеху павінны быць і мастацка-адукацыйныя "устон". Таму ў Беларусі цэнтрам падрыхтоўкі мастацтвазнаўцаў можа быць толькі Менск, каб студэнтам быў сэнс траціць час і грошы на такую адукацыю.

***Уладзімір Амосаў, дырэктар "Школы мастацтваў", Полацкі р-н.***

# Гісторыя Беларусі ў мастацкіх вобразах і біяграфіях

Вывучаць гісторыю Беларусі можна без наведвання бібліятэк ці некаторых сумных лекцый заангажаваных выкладчыкаў. Апошнім часам у сеціве з'явілася даволі цікавая і аб'ёмная паліца сайтаў, якая была сфармавана сябрамі клуба "Спадчына". Яна падае праўдзівую гісторыю нашай Бацькаўшчыны. Калі адкрыем партал Spadchyna.org у сайце "Нашы вялікія продкі" знойдзем мастацкія карціны і біяграфіі полацкіх князёў, князёў Вялікага Княства Літоўскага, палкаводцаў і дзяржаўных дзеячоў, асветнікаў, паэтаў, пісьменнікаў, змагароў. Да прыкладу, назавём толькі некаторыя імёны: Ефрасіння Полацкая, Усяслаў Чарадзей, Францішак Скарына, Мікола Гусоўскі, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Кірыл Тураўскі, Сімяён Полацкі, дзяржаўныя дзеячы Радзівілы, Храптовічы, Сапегі, Агінскія, ды шэраг іншых, якія ўславілі Беларусь сваімі справамі. Увесь спіс налічвае звыш 70 імёнаў. На кожнага з іх пададзены мастацкія творы беларускіх мастакоў, а на некаторых да дваццаці пяці работ. Дадаюцца пашыраныя біяграфіі іх жыццяпісу. Маюцца спасылкі на навуковыя крыніцы. Калі зойдзем на сайт "Адраджэнцы Беларусі", то ўбачым шмат папак, з адпаведнымі раздзеламі па гісторыі Беларусі. Яны ўтрымліваюць сведчанні пра такіх знакамітых асобаў як Андрэй Тадэвуш Касцюшка і яго паплечнікі па змаганні Якуб Ясінскі, Стэфан Грабоўскі, Клеафас Агінскі і іншыя, а таксама дзеячы рэвалюцыйнага руху 1831 года і паўстання 1863-1864 г. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага: Францішак Багушэвіч, Эмілія Плятэр, Дунін Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля. У папках маюцца сведчанні пра дзеячоў "Нашаніўскага" перыяду, тых хто першымі распачаў сапраўдны нацыянальны незалежны рух ад Польшчы і Расіі, хто стварыў першую беларускую палітычную партыю "Грамада", заснаваў першыя беларускія газеты, якія распаўсюджваліся легальна, хто філасофскі абаснаваў неабходнасць незалежнай суверэннай Беларусі і ў 1918 г. удзельнічаў у яе стварэнні. У папках каля 150 партрэтаў і біяграфій гэтых выбітных дзеячоў нацыянальнага беларускага адраджэння. Адна з папак прысвячаецца дзеячам Заходняй Беларусі, якія ў цяжкіх варунках польскай акупацыі працягвалі змаганне за незалежную Беларусь. Асобная папка прысвечана дзеячам духоўнага адраджэння. Яны першыя паднялі голас у абарону і правядзенне набажэнства на роднай мове: Міхаіл Бабровскі, Вінцэнт Гадлеўскі, Адам Станкевіч, Станіслаў Глякоўскі, Антон Неманцэвіч, Мелхісэдэк, і іншыя. Эстафету ад іх перанялі сучасныя дзеячы духоўнага адраджэння Ігар Лашук, Уладзіслаў Завальнюк, Леў Гарошка, Станіслаў Коўш, Аляксандр Надсан, Ян Матусевіч, Уладзіслаў Чарняўскі і шэраг іншых. Дзеячы беларускага замежжа ўключаны ў цэлую папку адзначанага сайта: Мікола Абрамчык, Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Язэп Сажыч – былыя старшыні рады БНР, пісьменнікі, дзеячы культуры і навукі: Кастусь Акула, Наталля Арсеннева, Барыс Кіт, Мікола Равенскі, Алесь Салавей, Мікалай Шчаглоў (Куліковіч), Масей Сяднёў, Вітаўт Тумаш і іншыя. ¨сць папка, якая прадстаўляе дзеячоў сучаснага адраджэння і культуры: Алесь Адамовіч, Ларыса Геніюш, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Мулявін, Віктар Скарабагатаў, Іван Шамякін, Міхась Ткачоў, Леанід Шчамялёў, Яўген Ціхановіч, Станіслаў Суднік, Людміла Майсеня і шмат іншых. На прыканцы гэтага сайта ёсць папка сяброў клуба "Спадчына", арганізацыі, якая яго стварыла. Асобны сайт займае "Грунвальд", які ўяўляе сабой энцыклапедычны даведнік створаны дзеячамі беларускай гісторыі, выяўленчага мастацтва, кампазітарамі, музыкантамі, паэтамі і пісьменнікамі. На заключэнне адзначым сайт на 1700 файлаў "Наш люстрадзён" з паўсядзённымі і памесячнымі датамі нараджэння выбітных дзеячоў нашай культуры і адраджэння, а таксама тымі гістарычнымі падзеямі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі на працягу звыш двух тысяч год. Асобная папка "Храналогія гісторыі Беларусі". І на прыканцы, унікальная праца сяброў сяброў клуба "Спадчына". На сайце "Кнігі" запампавана "Энцыклапедыя Беларусі: Асветнікі і мысліцелі Беларусі 9 – 19 ст.", дзе змешчаны звыш двух тысяч славутых імёнаў дзеячоў нашай Бацькаўшчыны. Па пералічанаму можна канстатаваць пра стварэнне ўнікальнай віртуальнай гісторыі Беларусі, якой можна ганарыцца і карыстацца ва ўсім свеце.

***Пятро Русаў, гісторык, краязнавец.***

*Рэдактар Станіслаў Суднік*

*Заснавальнік:*
ТБМ імя Францішка Скарыны.
*Пасведчанне аб рэгістрацыі:*
№ 83 ад 27 сакавіка 2007 г.
*Адрас рэдакцыі:*
231293, Лідскі р-н, в. Даліна.
*Адрас для паштовых адпраўленняў:*
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
*E-mail:* naszaslowa@tut.by
**http://tbmlida.byhost.org**

*Рэдакцыйная калегія:*
Людміла Дзіцэвіч, Вольга Іпатава, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Аляксей Пяткевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

*Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі*

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 9. 11. 2009 г. у 10.00. Замова № 2481.
Аб'ём 1 друкаваны аркуш. Наклад 2000 асобнікаў.
*Падпісны індэкс:* 63865.
*Кошт падпіскі:* 1 мес.- 2730 руб., 3 мес.- 8190 руб.
*Кошт у розніцу:* па дамоўленасці.